УДК 801.22.26 (476)

*А.В.Солахаў*

# АБСТРАКТНЫЯ НАЗОЎНІКІ-НАВАТВОРЫ СА ЗНАЧЭННЕМ ЯКАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Сярод абстрактных назоўнікаў-наватвораў са значэннем якасці ў сучаснай беларускай паэзіі самай высокай прадуктыўнасцю вызначаюцца ўтварэнні з суфіксам

*-асц ь* (іншы раз *-осць*). Гэта заканамерна, бо актыўнасць суфікса *-асць* праявілася яшчэ ў старабеларускай мове ў розных жанрах пісьменнасці [1, 151-173; 2, 17-19; 3, 104-131], а ў сучаснай беларускай літаратурнай мове даследчыкі налічваюць больш за тры тысячы назоўнікаў на *-асць* [4, 96], прычым іх колькасць пастаянна і няўхільна расце.

У творах сучаснай беларускай паэзіі назоўнікі-наватворы з суфіксам *-асць* утвараюцца па традыцыйных словаўтваральных мадэлях і нетрадыцыйных, не ўласцівых гэтаму словаўтваральнаму тыпу, аказіянальных.

Пры традыцыйным утварэнні назоўнікаў на *-асць* утваральнымі з'яўляюцца асновы якасных і адносных прыметнікаў – самых разнастайных па сваёй марфалагічнай структуры. Найбольш актыўна суфікс *-асць* узаемадзейнічае з асновамі прыметнікаў на *-н-*, што тлумачыцца лінгвістамі прадуктыўнасцю гэтага класа прыметнікаў у сучаснай беларускай і старабеларускай мовах [5, 98], іх здольнасцю выражаць як якасныя, так і адносныя значэнні [6, 137] (*асветны-асветнасць, здрадны-здраднасць, наступны-наступнасць, полымны-полымнасць, радарны-радарнасць, роспачны-роспачнасць, сургучны-сургучнасць, тлумны - тлумнасць, хмельны-хмельнасць*)*: Ішла дзятва па кніжкі ў дом асветнасці вясковы* (Е.Лось, 163)*; Хцівец скача, як вар'ят, З радасці, з радасці, Што вам сыпе ў душы яд Здраднасці, здраднасці* (Н.Гілевіч 1, 2, 115)*; Прысвячалі сябе, хто як мог, мы наступнасці* (А.Разанаў, 38)*; І застанецца з намі ранак гожы, птушыны грай і полымнасць рабін* (Р.Баравікова, 417)*; Паэт гаворыць адгукаючыся: ён мае ўласцівасць, здольнасць, радарнасць чуць тое, што іншых прамінае, не кранаючы* (А.Разанаў, 202)*; Раптоўнай роспачнасці быстра Не суціхала, Нямела доўга* (Р.Барадулін 2, 62)*; Што чэк тленнавечны, сухі пратакол, Пячатка - яе сургучнасць*?! (Р.Барадулін 1, 352)*; Што хвілінным было і мізэрным, а складалася ў тлумнасць і спех* (Р.Баравікова, 372)*; І растае на вуснах смелых смех, Упершыню зазнаўшы хмельнасць гону* (А.Шушко, 14). Многія з адзначаных наватвораў суадносяцца з прыметнікамі толькі па структуры, а семантычна яны звязаны з назоўнікамі, ад якіх утвораны прыметнікі.

Другую найбольш прадуктыўную групу наватвораў складаюць назоўнікі, утвораныя ад асноў прыметнікаў з суфіксам дзеепрыметнікавага паходжання *-л-*, бо прыметнікі гэтага тыпу даволі распаўсюджаны ў сучаснай беларускай мове (*абрыдлы-**абрыдласць**, гіблы-**гібласць**, дарослы-**дарослiасць**, збалелы-**збаленасць**, зніклы-**знікласць**, мінулы-**мінуласць***)*: Я таплюся у хвалях **абрыдласці** новай* (Л.Сіманёнак, 28)*; Не вяртаючы **гібласць** імшар, Паважаючы сілу метала, не дапусціць усё-ткі душа, Каб іх раптам на свеце не **стала*** (Г.Бураўкін, 202)*; Сын, не пужай **дарослацю** мяне* (Е.Лось, 266)*; Нашто ты носіш у вачах такую адзічэлую **збаленасць?!*** (Н.Загорская, 51)*; І стала ясна мне прычына Раптоўнай **знікласці** такой* (Н.Гілевіч 1, 1, 76)*; Калі ў **мінуласць** Беларусі Прасекчы добрае акно І паглядзець на ўсё вачыма, Не замутнёнымі яшчэ - Не раз і гордасць дойме шчыра, Не раз і болем апячэ* (Н.Гілевіч1, 2, 220). Асновы прыметнікаў з іншымі суфіксамі , складаныя і прэфіксальныя асновы ўдзельнічаюць ва ўтварэнні назоўнікаў з суфіксам *-асць* радзей (*векавечны-**векавечнасць**, веснавы-**веснавосць**, дзіклівы-**дзіклівасць**, дрыгатлівы-**дрыгатлівасць**, дрыготкі-**дрыготкасць**, няпросты-**няпростасць***)*: Маўчаць **векавечнасці** кручы* (В.Ярац, 5)*; Чакае Чэсь мінальнай **веснавосці*** (Г.Юрчанка, 82)*; **дзіклівасць**-наша рыса з даўнасці* (Н.Гілевіч 1, 1, 329)*; я пазнаю сябе... у **дрыгатлівасці** асінак* (Г.Юрчанка, 50)*; **Дрыготкасць** вуснаў палкіх і плячэй* (З.Марозаў, 143)*; Мастацтву ўласціва нейкая **няпростасць*** (А.Разанаў, 201).

Пры ўтварэнні назоўнікаў з суфіксам *-асць* нярэдка назіраецца разыходжанне семантыкі наватвора з семантыкай матываванага прыметніка. Справа ў тым, што

МДПУ імя І.П.Шамякіна

матываваны прыметнік атрымлівае новае, пераноснае значэнне непасрэдна пры ўтварэнні назоўніка. Яно ўзнікае дзякуючы вялікім патэнцыяльным магчымасцям прыметніка развіваць метафарычныя значэнні (***аглухлы*** "які стаў глухім" - *перан.* "які не праяўляе пяшчоты, пусты" - ***аглухласць*** "адсутнасць пяшчоты, пустата"; ***віхурны*** "які мае дачыненне да віхуры; падобны на віхуру" - *перан.* "жыццёва нялёгкі, складаны" - ***віхурнасць*** "жыццёвая складанасць"; ***выкручасты*** "з мноствам паваротаў, звілісты" - *перан.* "празмерна складаны" - ***выкручастасць*** "празмерная складанасць"; ***вясёлкавы*** "які мае колер вясёлкі, шматкаляровы" - *перан.* "поўны радасці, жыццярадасны" - ***вясёлкавасць*** "жыццярадаснасць"; ***горны*** "які знаходзіцца ў гарах" - *перан.* "недаступны" - ***горнасць*** "недаступнасць"; ***дрымучы*** "стары, густы, непраходны" - *перан.* "ціхі, таямнічы" - ***дрымучасць*** "цішыня, таямнічасць"; ***заспаны*** "са слядамі нядаўняга сну, сонны" - *перан.* "які знаходзіцца ў стане спакою, здранцвелы" - ***заспанасць*** "здранцвенне, знаходжанне ў стане спакою"): *У сэрцы* ***аглухласць*** *адна і жыве* (Р.Баравікова, 384); *Я класці скаргі не ахвочы, Хоць у* ***віхурнасці*** *гадоў Мяне імкнуўся гном сурочыць, злы дух распетрыць быў гатоў* (Г.Юрчанка, 32); *У скрушнай* ***выкручастасці*** *падзей Спяваю гімн няскончанай карыдзе* (Л.Сіманёнак, 46); *Твая* ***вясёлкавасць*** *не ўскалыхне, Таму, хто яваю не ашуканы, Навошта мыліцы самападману? Пакінь мяне* (Н.Мацяш, 29); *Няхай уласнай* ***горнасці*** *гара не засланяе пра другое думкі* (Е.Лось, 148); *Ляці, мая мелодыйка, ляці! Будзі сінічкаю* ***дрымучасць*** *неба* (Н.Мацяш, 28); *Густы і цёплы,* [дождж] *хлынуў з вышыні - Змываць пазім'е, разганяць* ***заспанасць*** (Н.Гілевіч 1, 1, 235).

Значная частка наватвораў з суфіксам *-асць* мае розныя структурныя адхіленні ад традыцыйных словаўтваральных мадэляў, што праяўляецца ў здольнасці ўказанага суфікса спалучацца з асновамі іншых часцін мовы. Пры гэтым адзначаюцца наступныя асаблівасці:

1) суфікс *-асць* далучаецца да асноў назоўнікаў і займеннікаў непасрэдна: *глыб -* ***глыбасць***, *гора -* ***горасць***, *шыр -* ***шырасць***, *сам -****самасць***, *столькі -* ***столькасць***: *У рэках -* ***глыбасць***, *Небе -* ***шырасць***, *І толькі шчырасць у душы!* (Р.Барадулін 1, 391); *Хто бачыў тыя вашы губы, І жах, і* ***горасць*** *у вачах* (У.Лісіцын, 14); *А не павінен ён* [чалавек] *перш за ўсё быць тым, хто "захапляецца" сабою, хто ўвасабляецца ў эгаізм, хто жывіць* ***самасць*** (А.Разанаў, 175); *Сам жа стол не якасць і не колькасць, а "****столькасць****"* (А.Разанаў, 111);

2) ад асноў назоўнікаў і займеннікаў новыя назоўнікі ўтвараюцца і праз ступень, г. зн. з прырашчэннем да суфікса *-асць* элементаў *-н-*, *-яв-*, *-асн-*, *-ёйн-*, у выніку адсутнасці адпаведных прыметнікаў у мове: *двурушша -* ***двурушнасць***, *плынь -* ***плыннасць***, *рунь -* ***рунявасць***, *сам -* ***самаснасць***, *усё -* ***усёйнасць***: ***Двурушнасць*** *- чалавечнасці магіла* (З.Марозаў, 265); *Бруенне рэчак,* ***плыннасць*** *рэк* (Н.Гілевіч 3, 307); *З пашанай хочацца схіліцца Над зыбкай шыбінай стаўка Перад* ***рунявасцю*** *ігліцы* (Р.Барадулін 1, 391); *І чым менш у ім [чалавеку] самога сябе, яго* ***самаснасці***, *тым больш ён чуйны, тым больш ён у с ё,* увесь *Сусвет* (А.Разанаў, 203); *У вастрыі матэрыя не збядняецца, а ўзбагачаецца -* ***усёйнасцю***, *усюднасцю* (А.Разанаў, 203);

3) наватворы з суфіксам *-асць* узнікаюць праз ступень прэфіксальна-суфіксальным спосабам і матывуюцца сінтаксічнымі канструкцыямі "прыназоўнік + назоўнік (займеннік)". Пры гэтым суфікс *-асць* прырашчае элементы *-оўн-*, *-н-*, *-ов-* (*без сэнсу -* ***бессэнсоўнасць***, *над бытам -* ***надбытнасць***, *па-за сабой —* ***пазасабовасць***): ***Бессэнсоўнасць*** *жыцця вымушае шукаць далячынь* (І.Пракаповіч, 16); *Сутонлівую гаць* ***надбытнасцю*** *запаланіла слота* (Г.Юрчанка, 96); *Ён* [чалавек], *як антэна, змястоўны не сабой, а* ***пазасабовасцю*** (А.Разанаў, 203);

МДПУ імя І.П.Шамякіна

4) часам матывуючым выступае словазлучэнне "займеннік + назоўнік", ад якога складана-суфіксальным спосабам, праз ступень, з прырашчэннем да суфікса *-асць* элемента *-н-*, і ўтвараецца новае слова (*іншая мера* -- ***іншамернасць***): *Мастацтву ўласціва нейкая няпростасць,* ***іншамернасць****, якая не паддаецца канчатковаму засваенню і тлумачэнню;* ***Іншамернасць*** *-- уласцівасць жывога* (А.Разанаў, 202);

5) слова можа ўтварацца спосабам накладання асновы аднаго назоўніка на аснову другога *(кія якасць --* ***кіякасць****)*: *Кій -- кіраўнік, і які б ён не быў па сваёй "****кіякасці****" -- цяжкі ці лёгкі, стрункі ці камлюкаваты, ён ідзе наперадзе і паказвае вандроўніку кірунак* (А.Разанаў, 124);

6) пры ўтварэнні назоўнікаў з суфіксам *-асць* ад дзеясловаў выкарыстоўваецца не аснова дзеепрыметніка, а аснова інфінітыва, ад якой новае слова ўтвараецца прэфіксальна-суфіксальным спосабам, з прырашчэннем да суфікса элементаў *-л-*, *-н-* (*пастаяць* - ***непастойнасць****, спасцігнуць* - ***неспасцігласць****, улежыць* - ***няўлежнасць***)*: адно на ёй Каласа ваць таму спакою, Што* ***непастойнасцю*** *сваёй Znявечаную памяць гоіць* (Н.Мацяш, 16); *У нетрах* ***неспасцігласці*** (Г.Юрчанка); *Пакутуеш? Трывога і* ***няўлежнасць****? Спі, жонка!* (Р.Баравікова, 243);

7) іншы раз назоўнікі на *-асць* утвараюцца ад асноў прыслоўяў, у якіх фіналі, выражаныя галоснымі, звычайна адсякаюцца. Суфікс *-асць* можа далучаецца да ўсечаных асноў непасрэдна *(многа --* ***многасць****)* або спалучаецца з імі праз ступень, з прырашчэннем да суфікса элемента *-н-* (*усюды --* ***усюднасць***): *Плён мераецца не колькасцю твораў..., не* ***многасцю*** *-- а дастатковасцю* (А.Разанаў, 191 ); *У вастрыі матэрыя не збядняецца, а ўзбагачаецца -- усёйнасцю,* ***усюднасцю*** (А.Разанаў, 203).

Прыклады паказваюць, што суфікс *-асць* лёгка спалучаецца з рознымі асновамі, не змяняючы іх гукавога аблічча і захоўваючы без змен свой гукавы комплекс, г. зн. пры словаўтварэнні назоўнікаў з суфіксам *-асць* адсутнічаюць перашкоды марфаналагічнага зместу .

Група назоўнікаў на *-асць* папаўняецца таксама за кошт далучэння розных па значэнні прэфіксаў да існуючых утварэнняў з гэтым суфіксам (*існасць --* ***даіснасць****, колькасць --* ***някалькасць***): *мая* ***даіснасць*** плакала *па мне ад вераду пустэльнага няўцям'я* (Г.Юрчанка, 96); *Плён мераецца не колькасцю твораў, а іхняй* ***някалькасцю*** *- выключнасцю* (А. Разанаў, 191).

Да назоўніка з суфіксам *-асць* можа далучацца аснова назоўніка або парадкавага лічэбніка *(творчасць жыцця --* ***жыццятворчасць****, першая радасць --* ***першарадасць****)*: *пераходзячы ў сваю новую якасную фазу, "скрыжоўваючыся" з жыццём, творчасць становіцца* ***жыццятворчасцю****, якое не мае патрэбы ў "пасрэдніках"* (А.Разанаў, 95); *З Катулам* ***Першарадасць****, і дакор, І смутку пажаданая прычына* (Р.Барадулін, 2, 325).

Называючы адцягненую якасць, уласцівасць або стан, якія матывуюцца ўтваральнымі асновамі, назоўнікі з суфіксам *-асць* канкрэтызуюць сваё значэнне ў паэтычным кантэксце. Яны абазначаюць маральныя якасці чалавека (*аглухласць, вясёлкавасць, горасць, дзіклівасць, захопленасць, роспачнасць)*, яго фізічны стан (*дарослась, дрыготкасць*), стан навакольнага асяроддзя (*дрымучасць, заспанасць, плыннасць*), стан прадметаў (*дрыгатлівасць*), а таксама зрокавыя (*полымнасць, рунявасць*), прасторавыя (*глыбасць, шырасць*), часавыя (*векавечнасць, веснавосць, мінуласць, наступнасць*), разумовыя (*бессэнсоўнасць*) і іншыя ўласцівасці.

Назоўнікі-наватворы з іншымі суфіксамі сустракаюцца значна радзей. Найбольшай актыўнасцю з іх вызначаюцца ўтварэнні з суфіксам *-эч (-еч)*, непрадуктыўныя ў літаратурнай мове і прадуктыўныя ў народных гаворках [7, 138]. Яны матывуюцца пераважна прыметнікамі, утваральныя асновы якіх уступаюць у спалучэнне з суфіксам або ў поўных формах *(сыры --* ***сырэча****, цёмны --* ***цямнеча****, чорны --* ***чарнеча****, шэры --****шарэча****, ясны --* ***яснеча****)*, або ва ўсечаных *(сцюдзёны --*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*сцюдзеча, шырокі — **шырэча**): Мокра ў **сырэчы** ўзбухла Я ад расы* (М.Мятліцкі 3, 14); *Адліга ўздыхае ў вільготнай **цямнечы*** (Л.Рублеўская, 281); *І набрынялы снег, што быў учора чысты, **Чарнечаю** сырой між першых ручаін* (М.Мятліцкі1, 156), *Спаўзла пад елкі языкамі **Шарэча** снегу* (М.Мятліцкі1, 154); *Чакаю **яснечы**, чакаю вятроў, Чакаю **сцюдзечы**, чакаю снягоў* (П.Броўка, 4, 122); *Я — адзінотнік горды, **Шырэчай** маіх нябёс Зорак пламенныя орды Сумна вядзе Хрыстос* (М.Мятліцкі3, 103). Далучаючыся да асноў назоўнікаў, суфікс *-эч* узмацняе якасць таго, што абазначана матывуючай асновай *(голад — **галадэча**, макрата — **макратэча**, цемра — **цямрэча**): І цікуе пад ім* [блакітам] *за намі **Галадэчы** імунная СНД* (М.Мятліцкі3, 105); *У каморы пануе заўсёдны морак: і ў спёку, і ў вецер, і ў **макратэчу** у ёй, бы ў скрыёмных харомах, утульна* (А.Разанаў, 132); *А зыкі прапалі ў **цямрэчы*** (Д.Бічэль-Загнетава, 12).

Некаторай прадуктыўнасцю вызначаюцца наватворы з суфіксам *-ынь (-інь)*. У адрозненне ад назоўнікаў з гэтым суфіксам у дыялектнай мове, якія ўтвараюцца ад аднакаранёвых прыметнікаў, у беларускім паэтычным маўленні яны ўтварыліся спосабам дэфлексацыі, г.зн. ад асноў узуальных назоўнікаў шляхам выдалення матэрыяльна выражанай флексіі *-я (высачыня - **высачынь**, гарачыня - **гарачынь**, глыбіня - **глыбінь**, светлыня - **святлынь**): Няўжо зіхотна з небнай **высачыні** Сарвецца ён* (М.Мятліцкі3, 77); ***Гарачынню** святло скрозь мяне працякае* (А.Канапелька, 44); *Дзе такія дажджасеі! А хаціны, як грыбы, Белай ножкай зрубаў селі У зялёную **глыбінь*** (У.Лісіцын, 10); *Мне б іх [успамінаў] **святлынь** у слове перадаць!* (З.Марозаў, 246).

Назоўнікі з суфіксам *-ств-а* ўтвараюцца ад асноў прыметнікаў і назоўнікаў і абазначаюць адцягненыя якасці або ўласцівасці. Утваральныя асновы пры далучэнні суфікса могуць усякацца *(местачковы - **местачкоўства**, таемны - **таемства**, хвалебны - **хвалебства**, валадар - **валадарства**, флюгер - **флюгерства**): Бог вам суддзя! Хоць судзіце не вы - Амбіцыі і пыха **местачкоўства*** (З.Марозаў, 36); *І згадаеш: Вечар залаты, Тры багіні на адной сцяжыне, Горкае **таемства** пекнаты* (Г.Булыка, 167); ***Хвалебстваў** суняўся віхор* (Н.Гілевіч1, 2, 68); *А пад кронай гаючага царства Я пакорна хілю галаву, Адчуваючы моц **валадарства*** (В.Лужкоўскі, 39); *А вы разводзіце гаўэнду, Зноў ваша **флюгерства** відаць* (А.Майсеенка, 29).

Суфіксальным спосабам утвораны некаторыя адзінкавыя назоўнікі з суфіксамі *-адзь, -ак, -ань, -аць, -ін-ы, -іц-а, -к-а, -от-а, -ыв-а* (*роўны - **роўнадзь**, густы - **гушчак**, свежы - **свежань**, пекны - **пекнаць**, журба - **журбіны**, безгалосы - **безгалосіца**, бывалы - **бываліца**, нечаканы -**нечаканка**, , светлы - **святлота**, цесны - **цяснота**, цемра - **цемрыва**): даруй, не **роўнаддзю** адною Прынёс табе сваё я пачуццё* (У.Лісіцын, 96); *Апошні ліст саб'ецца з крыл, **Гушчак** асінавы абшарыць* (У.Лісіцын, 75); *Снежань-**свежань**, браце мой, ты здружы мяне з зімой!* (Е.Лось, 268); *Я б мог кукарэкнуць пра лёзную **пекнаць**, ды бацька лазой малавата вучыў* (Г.Юрчанка, 91); *Каб адагнаць **журбіны**, успомні край лясны* (М.Дукса, 58); *У буянні дзядоўніку, руты і хмелю **Безгалосіца** ў скрусе галосіць (пачуй)* (Г.Юрчанка, 89); *У цёплай хаце мінскіх кватарантак **Бываліцамі** гаспадар частуе* (Н.Гілевіч3, 156); *Вось **нечаканка** дзе, Вось дзіва з дзіў!* (Г.Бураўкін, 9); *А цяпер... прымер гэтай шчырай хвіліны абнову. Не ўкарочвай **святлоты** яе* (Н.Мацяш, 49); *Стаміўся ў тлуме і **цясноце*** (П.Броўка, 4, 274); *У **цемрыве** касмічнай пустаты Кругляе Марс - памёршая планета* (М.Мятліцкі3, 91).

У творах беларускай паэзіі ўжываюцца абстрактныя назоўнікі-наватворы, якія абазначаюць якасць і ўтварыліся нульсуфіксальным спосабам. Як правіла, яны матывуюцца прыметнікамі *(блізкі — **блізь**, бязмежны — **бязмеж**, запаведны — **запавед**, пажадлівы — **пожадзь**, раскосы — **роскась**, салодкі — **соладзь**, юны — **юнь**): Не хочам знаць ні даль, ні **блізь** мы* (А.Майсеенка, 8); *І песня ў невадзе яго звінела, І*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*вырывалася ў* ***бяз межс-прасцяг*** (Н.Гілевіч 1, 1, 304)*; Ну, што ж рабіць! Далей - ні кроку. Далей - табу і* ***запавед*** (Н.Гілевіч 1, 2, 330)*; Глядзеў, закуты ў згодлівы спакой, як* ***пожадзь*** *карчавала іх* [балоты] *рукой* (М.Мятліцкі 2, 5)*; Мой друг Тарва прыехаў з-за мяжы, мангольскі стэп у* ***роскасі*** *вачэй* (Е.Лось, 173)*; Сакаўною* ***соладдзю*** *Вабілі суніцы* (Н.Гілевіч 2, 23)*; Няма шляхоў назад віхурнай* ***юні*** (Г.Юрчанка, 98).

Па прадуктыўным словаўтваральным тыпе ўтвараюцца назоўнікі-наватворы з прэфіксам *без- (бяз-, бяс-)* і суфіксам *-j-э*, якія абазначаюць з'явы з адсутнасцю таго, што названа ўтваральным словам *(галава -* ***безгалоўе****, дом -* ***бяздом'е****, зоры -* ***бяззор'е****, лужа -* ***бязлужжа****, мова -* ***бязмоўе****, род -* ***бязроддзе****, снег -* ***бясснежжа****, цень -* ***бясценне****)*: *І што рабіцьмеш з* ***безгалоўем****?!* (І.Курбека, 160); *Што такое* ***бяздом'е*** *сцюжнае* (Е.Лось, 19); *Бязмежжа.* ***Бясснежжа. Бяззор'е.*** *Ну хоць бы сняжынка ці кволая зорка* (А.Пісьмянкоў, 189); *Той, хто марыў аб* ***бязлужжы****, Па ім сумуе недзе ў першы год* (У.Лісіцын, 118); *Я не хачу пачуць* ***бязмоўе*** *дня* (М.Мятліцкі3, 24); ***Бязроддзе*** *душ, нібы бязводдзе рэк, - Як скута сохнеш духам, чалавек, П'ючы быццё зямнога асалоду* (М.Мятліцкі 3, 80); *Выгінаўся з адценнем* ***бясцення*** *Нечы тонкі паўпрывідны стан* (Г.Юрчанка, 114).

Асобныя наватворы ўтварыліся ад асноў назоўнікаў пры дапамозе прэфікса *су-* і суфікса *-j-э*. Яны называюць з'яву, што складаецца з дзвюх аднолькавых (*голас -* ***сугалоссе****, час -* ***сучассе***): *Гуло струной трывожнай Нада мной мае* ***сучассе*** (Н.Гілевіч 1, 1, 313); *пералескам, між сосен Блукаў на змярканні паэт І слухаў вясны* ***сугалоссе*** (Н.Гілевіч 1, 2, 122).

Такім чынам, у беларускіх паэтычных творах сярод абстрактных назоўнікаў са значэннем якасці найбольш пашыраны наватворы з суфіксам *-асць*. Высокая частотнасць іх утварэння і функцыянавання тлумачыцца рознымі прычынамі. Па-першае, на прадуктыўнасць іх у паэтычных тэкстах уплывае агульная актыўнасць суфікса *-асць* на працягу ўсёй гісторыі развіцця беларускай літаратурнай мовы, у тым ліку высокая распаўсюджанасць іх у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Па-другое, пры далучэнні да ўтваральных асноў суфікс *-асць* не ставарае марфаналагічных перашкод, а таму мае разгалінаваныя словаўтваральныя сувязі з прыметнікам, якія пашыраюцца на іншыя часціны мовы. І, нарэшце, набываючы розныя семантычныя адценні, назоўнікі з суфіксам *-асць* поўнасцю адпавядаюць патрэбам паэтаў у пошуку найбольш дакладнага, найбольш ёмкага слова для абазначэння адцягненай якасці.

***Літаратура***

1. Паўленка М.А. Назоўнікі на -ость, -осць (-асць) ад вытворных асноў прыметнікаў у беларускай мове // Даследаванні па беларускай і рускай мовах. - Мн.: Выд-ва БДУ імя У.І.Леніна, 1958. - С.151-173.

2. Солахаў А.В. Абстрактная лексіка ў мове прадмоў і пасляслоўяў старабеларускай літаратуры //Беларуская мова: Міжведамасны зборнік. - Мн.: Універсітэцкае, 1984. - Вып.12. - С.11-20.

3. Шанский Н.М. О происхождении и продуктивности суффикса -ость в русском языке // Вопросы истории русского языка.- М.: Изд-во Моск. ун-та, 1959.- С.104-131.

4. Лукашук М.П. Адпрыметнікавыя назоўнікі з суфіксам -асць у сучаснай беларускай літаратурнай мове // Праблемы мовы і літаратуры: Міжвузаўскі зборнік. - Мн.: Выд-ва БДУ імя У.І.Леніна, 1972. - С.96-103.

5. Лукашук М.П. Адпрыметнікавыя назоўнікі з суфіксам -асць у сучаснай беларускай літаратурнай мове.

МГПУ им. И.П. Шамякина

6. Бакина М.А. Потенциальные слова, мотивированные прилагательными, в современной поэзии //Слово в русской советской поэзии. - М.: Наука, 1975.-С.132 - 163.

7. Сцяцко П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне: Афіксальныя назоўнікі.- Мн.: Навука і тэхніка, 1977.- 320 с.

***Крыніцы***

Баравікова Р. Сад на капялюшыку каханай.- Мн.: Маст. літ., 1997.- 494 с.

Барадулін Р. Выбраныя творы: У 2-х т. - Т.1. - Мн.: Маст. літ., 1984. - 415 с.; Т.2. - Мн.: Маст. літ.,1984. - 335 с.

Бічэль-Загнетава Д. Гараднічанка.- Мн.: Юнацтва, 1993. - 47 с.

Броўка П. Збор твораў: У 9 т. - Т.4. -Мн.: Маст. літ., 1989. - 591 с.

Булыка Г. "Метакаханне"//Беларуская думка, 2000, № 3. -С.166 - 168.

Бураўкін Г. З кнігі "Жураўліная пара"//Полымя, 1999, № 10. -С.3 -13.

Бураўкін Г. Выбранае: 1955 - 1995. - Мн.: Маст. літ., 1998. - 382 с.

Гілевіч 1 Н. Збор твораў: У 6 т. - Т. 1. - Мн.: Маст. літ., 1996. - 350 с.; Т. 2. - Мн.: Маст. літ., 1999. - 335 с.

Гілевіч 2 Н. Калі рана ўстанеш.- Мн.: Юнацтва, 1984. - 143 с.

Гілевіч 3 Н. Наканаванае. - Мн.: Полымя, 1998. - 462 с.

Дукса М. Вершы // Полымя, 1999, № 6. - С. 47 - 58.

Загорская Н. Мне добра з вамі. - Мн.: Маст. літ., 1989. - 190 с.

Канапелька А. Летазлічэнне. - Мн.: Маст. літ., 1999. - 127 с.

Курбека І. Абы здароўе //Беларуская думка, 1999, № 11-12. - С. 160.

Лісіцын У. Беларусь - мая калыска. - Мн.: Маст. літ., 1990.- 167 с.

Лось Е. І каласуе даўгалецце. - Мн.: Маст. літ., 1998. - 367 с.

Лужкоўскі В. Смага. - Мн.: Выд-ва ЦК КП Беларусі, 1991.- 47 с.

Майсеенка А. Паклон. - Мн.: Дом прэсы, 1998. - 32 с.

Марозаў З. Гронкі зорных сužвеццяў. - Мн.: Маст. літ., 1998. - 366 с.

Мацяш Н. Душою з небам гаварыць. - Мн.: Маст. літ., 1999. - 459 с.

Мятліцкі 1 М. Вершы // Беларуская думка, 1999, № 6. - С. 154 - 157.

Мятліцкі 2 М. Вершы // Полымя, 2000, № 4. - С. 3 - 12.

Мятліцкі 3 М. Шлях чалавечы. - Мн.: Маст. літ., 1989. - 231 с.

Пісьмянкоў А. Я не памру, пакуль люблю. - Мн.: Маст. літ., 2000. - 319 с.

Пракаповіч І. Рэха малітваў. - Мн.: Полымя, 1993. - 32 с.

Разанаў А. Паляванне ў райскай даліне.- Мн.: Маст. літ., 1995.- 287с.

Рублеўская Л. Крокі па старых лесвіцах. - Мн.: Выд-ва ЦК КП Беларусі, 1990. - 47 с.

Сіманёнак Л. Разгорнуты сусвет. - Мн.: Маст. літ., 1999. - 95 с.

Шупко А. Выток і прычасце. - Мн.: Полымя, 1994. - 31 с.

Юрчанка Г. У натхнёнай паграбеньцы. - Мн.: Маст. літ., 1983.- 143с.

Ярац В. Добрыца. - Мн.: Выд-ва ЦК КП Беларусі, 1989. - 48 с.

***Summary***

New-formed nouns with abstract quality meaning in modern Belarussian are analysed in the article. Formations with the suffix *-асць (-осць)* are the most productive among them.

*Поступила в редакцию 31.01.02*

МГПУ им. И.П. Шамякина